«Основы музыкально-творческой деятельности». В процессе занятий в музыкально-творческой студии «Веселые музыканты» дети овладевают приемами игры на ударно-шумовых (деревянные и кожаные барабаны, бубны, бубенцы, треугольники, деревянные палочки, тарелки, коробочки, трещотки, кастаньеты, румбы и др.) ударно-звуковысотных (ксилофоны, металлофоны, глокеншпили), «природных» (звучащие жесты, хлопки, шлепки, щелканье пальцами, притопы) и струнно-щипковых (гусли) музыкальных инструментах.

В результате научно-педагогического исследования нами было отмечено, что организация творческо-ориентированной среды в музыкальной деятельности младших школьников способствует созданию условий для самореализации личности, удовлетворения ее эстетических, коммуникативных, рекреационных и творческих потребностей.

---

*Филистович, О. А.* Основы музыкально-творческой деятельности / О. А. Филистович // Основы музыкально-творческой деятельности: образовательная программа кружка для младших школьников. – Минск: РИВШ, 2010. – 12 с.

*Ю. Д. Царэвіч, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – Г. А. Барвенава,*
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

## САРМАЦКІ ПАРТРЭТ – ПАРТРЭТ НАЦЫЯНАЛЬНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА ГЕРОЯ

У канцы XVI – пачатку XVII ст. у выяўленчым мастацтве Беларусі пад уплывам ідэй Рэнесансу склаўся самастойны жанр партрэта. Яго росквіт прыходзіцца на XVII – пачатак XVIII ст., што ў большай ступені было абумоўлена сацыяльна-палітычным і культурным развіццём беларускага грамадства таго часу, шырокім распаўсюджваннем у ім сармацкай ідэалогіі. У аснову ідэі сарматызму быў пакладзены генеалагічны міф паходжання арыстакратычнага саслоўя краіны ад ваяўнічых сармацкіх плямёнаў, якія ў старажытныя часы прыйшлі на тэрыторыю ВКЛ і сталі мудра кіраваць народам. З канца XVI ст. абагульненым паняццем “сарматызм” пазна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалі стыль жыцця магнатаў і шляхты, спосаб мыслення арыстакратыі, падкрэсліваючы яе выключнасць і шматлікія палітычныя правы, сярод якіх магчымасць выбіраць сярод сваіх караля або “сарваць” рашэнне сойма адным голасам “супраць” (liberum veto), права непадпарадкавання і ўзброенага выступу супраць караля [1; 2].

Дзякуючы сарматызму ў грамадстве імкліва ўзрастала цікавасць да роду, сям'і, асобы, а кожны арыстакрат не толькі прагнуў багацця, але і жадаў пакінуць нашчадкам візуальнае сведчанне сваёй значнасці ў грамадстве [3]. Такім візуальным сведчаннем стаў партрэт з адлюстраваннем атрыбутаў генеалогіі, улады і пасад. У XVII ст. партрэтныя галерэі продкаў становяцца неад’емнай часткай радавых замкаў і сядзібаў беларускіх арыстакратаў [4].

Адмысловая функцыянальная скіраванасць партрэта (не толькі твор мастацтва, але і генеалагічны дакумент) абумовіла выпрацоўку шэрагу стылістычных рыс, якія заставаліся практычна нязменнымі на працягу многіх дзесяцігоддзяў: постаці адлюстроўваюцца ў рост (значна радзей пагрудны партрэт), на фоне драпіроўкі і (або) сімвалічных элементаў архітэктуры, у парадным адзенні з атрыбутамі ўлады або дзяржаўных пасад. Партрэт дапаўняўся пашыраным надпісам, які паведамляў імя, тытул, узнагароды і пасады партрэтаванага, а таксама некаторыя біяграфічныя дадзеныя. Уверсе партрэта адлюстроўваўся герб заказчыка. Такі тып партрэта атрымаў назву “сармацкі партрэт”, сярод якіх навукоўцы вылучаюць некалькі відаў: рыцарскі партрэт, партрэт святара, жаночы партрэт і інш. Найбольш распаўсюджаным і папулярным сярод іх быў рыцарскі партрэт, партрэт нацыянальнага і сацыяльнага героя, асобы, якая канцэнтруе ў сабе асноўныя рысы грамадзянскага ідэалу таго часу – рыцара-абаронцы Радзімы [5].

Выразна ілюструе сацыяльныя задачы сармацкага партрэта “Партрэт Юрыя І Радзівіла” першай паловы XVII ст. работы невядомага мастака (калекцыя НММ РБ). Юры І Радзівіл атрымаў ганаровую мянушку Геркулеса Літоўскага за перамогі больш чым ў 30 бітвах. Невядомы жывапісец знайшоў ідэальную адпаведнасць характару героя яго мастацкаму ўвасабленню, надаў выяве ўрачысты, прыўзняты настрой, падкрэсліў стрыманую моц, магутнасць і мудрасць героя. Парт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэт Юрыя I Радзівіла напісаны ў выключна рэпрэзентатыўнай манеры. Статычная фігура, закаваная ў адпаліраваную да бляску браню, стаіць ў зале сярэднявечнага замка, дзе падлога выкладзена белымі і чорнымі квадратнымі пліткамі, геаметрычны малюнак якіх мае сімвалічнае значэнне і акрэслівае глыбіню прасторы палатна. Рука воіна ляжыць на шлеме, упрыгожаным плюмажам і залатымі зарубкамі. На стале, побач з шлемам, знаходзіцца гетманская булава і жазло – атрыбуты пасады вялікага гетмана, якую Юры I Радзівіл займаў з 1531 г. На цёмным фоне рубінам зіхаціць абрус на стале з атрыбутамі служэння ВКЛ, смарагдам успыхваюць складкі заслоны, паблісквае на латах чырвоным золатам арнамент – фарбы карціны насычаныя, сакавітыя, яны дубліруюць геральдычныя колеры герба роду Радзівілаў [6, с. 63].

Калі ў мастацкай манеры выканання "Партрэта Юрыя I Радзівіла" адчуваецца значны ўплыў заходнееўрапейскага (першым чынам нямецкага) жывапісу, то "Партрэт Крыштофа Весялоўскага" 1636 г. (калекцыя НММ РБ) належыць пэндзлю мясцовага, верагодна, гродзенскага мастака. Дэкаратыўнасць каляровага рашэння, статычнасць постаці, адсутнасць перспектывы ў адлюстраванні мармуровых пліт падлогі збліжаюць гэты партрэт з іканапіснымі творамі XVII ст. Нягледзячы на ўмоўнасць мастак тонка перадаў сутнасць характару Крыштофа Весялоўскага і акцэнтаваў яго ў партрэтным вобразе. Створаны вобраз асобы, дзяржаўнага дзеяча, які гатовы падняцца над асабістымі сімпатыямі і амбіцыямі.

Так на працягу больш чым стагоддзя склаўся і заваяваў сваё месца ў структуры мастацкай творчасці Беларусі своеасаблівы нацыянальны тып сармацкага партрэта. XVII стагоддзе было часам яго росквіту, часам пошукаў і знаходак новых непаўторных формаў, якія дапамаглі ўвасобіць грамадскія ідэалы "шляхецкага народа". Сарматызм, карані якога ляжаць глыбока ў ўсходнееўрапейскай традыцыі, стаў арганічным здабыткам беларускай культуры, каштоўным захавальнікам памяці пра мінулае. Сармацкая ідэалогія і традыцыі барочнага мастацтва аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай мемарыяльнай пластыкі, помнікі якой адпавядалі імкненню прадстаўнікоў арыстакратыі перадаць веды і памяць наступным пакаленням, зацвердзіць прэстыж роду і ўшанаваць памяць продкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Вялікае* княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 1: Абаленскі–Кадэнцыя. – 2005. – 688 с.: іл.

2. *Вялікае* княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус–Яцкевіч. – 2006. – 792 с.: іл.

3. *Дыяруш* князя Міхаіла Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага, гетмана ВКЛ // Спадчына. – 1994. – № 4.

4. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 256 с.

5. *Тананаева, Л. И.* Сарматский портрет. Из эпохи польского портрета эпохи барокко / Л. И. Тананаева; под ред. докт. искусствоведения В. Н. Прокофьева. – Москва: Наука, 1979. – 304 с.: ил.

6. *Хадыка, А. Ю.* Непаўторныя рысы. З гісторыі беларускага партрэта / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.: іл.

*І. М. Цэван, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – І. А. Малахава,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭРМІНА “ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ” Ў СУЧАСНЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Каштоўнасці выступаюць асновай жыццядзейнасці як для асобнага чалавека, так і для групы людзей, пэўнага этнасу, чалавецтва цалкам. Нягледзячы на вялікую колькасць дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных каштоўнасным арыентацыям асобы, можна адзначыць адзінкавыя прыклады работ, прысвечаных вывучэнню тэарэтычных і практычных аспектаў менавіта этнакультурных каштоўнасцей. Пераважна пасля 2000 г. з’явіліся нешматлікія дысертацыі расійскіх аўтараў, у назве якіх заяўлены тэрмін “этнакультурныя каштоўнасці”. Сучасныя падыходы да яго вывучэння ўяўляюць сабой сінтэз розных навуковых кірункаў, методык і метадалогій, але трэба адзначыць, што да гэтага часу сутнасць, структура і спецыфіка ўжывання дадзенага тэрміна дакладна не вызначаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ